# СТАРОНКІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І ДУХОЎНАЙ МОЦЫ




**Вялікая Айчынная вайна ўсё далей адыходзіць у гісторыю, сведак таго страшэннага часу застаецца ўсё менш, але ж ёсць памяць. І пакуль будуць ствараецца фільмы пра вайну і пісацца кнігі, пакуль у дзіцячых садках будуць развучвацца ваенныя песні, а ў школе – вершы, пакуль гэта тэма будзе адкрыта і праўдзіва разглядацца на асобных занятках ва ўстановах вышэйшай адукацыі, а кожны беларус будзе лічыць Дзень Перамогі – адным з галоўных свят нашай краіны, мы не страцім памяць аб вайне.**

Менавіта пра гэта, напэўна, думаў кожны, хто напярэдадні святкавання Дня горада Віцебска прысутнічаў на прэзентацыі трэцяга выдання кнігі «Витебское подполье» (папярэднія друкаваліся ў 1969 і 1974 гадах). Сярод аўтараў гэтай кнігі – Ніна Дарафеенка (1923 – 2015), кандыдат гістарычных навук, дацэнт, якая шмат гадоў выкладала ў ВДПІ імя С.М. Кірава. Яе суаўтарамі сталі журналісты Мікалай Дарафеенка і Мікалай Пахомаў.

Ініцыятарам перавыдання кнігі стала Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, а пабачыла свет яна ў выдавецкім доме «Звязда». У выданні змешчана ўклейка з фотаздымкамі з альбома, які прыкладаўся да кандыдацкай дысертацыі Ніны Дарафеенка. У дадатку надрукаваны апошні артыкул Ніны Іванаўны пра подзвіг Веры Харужай у Віцебску.

Прадмову да трэцяга выдання падрыхтаваў загадчык кафедры гісторыі і культурнай спадчыны ВДУ імя П.М. Машэрава **Анатоль ДУЛАЎ,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Анатоль Мікалаевіч пракаментаваў, чаму варта чытаць кнігу:

«Гэта, безумоўна, народная кніга. І таму, што яна прысвечана лёсам простых людзей, мужчын і жанчын, прадстаўнікоў беларускага народа розных узростаў і прафесій, якія ў экстрэмальных умовах германскай акупацыі ахвяравалі дзеля Радзімы ўсім, нават самім жыццём. Таксама кніга народная, бо ў гады майго юнацтва, калі мне ўпершыню давялося з ёй пазнаёміцца, яна была амаль у кожнай віцебскай сям'і. Некаторыя мелі яе, бо там пісалася пра родных, сяброў, суседзяў, знаёмых. І тых, што загінулі ў барацьбе з нацызмам, і тых, хто вярнуўся да мірнага жыцця і адбудоўваў Віцебск. А іншыя мелі кнігу проста таму, што гаворка ішла пра блізкую гісторыю роднага горада. Хаця значэнне подзвігу герояў, а, значыць, і яго даследавання, куды больш шырокае.

Кніга «Витебское подполье» – вельмі моцная кніга. Моцная, таму што ў ёй распавядаецца пра звычайных людзей, якія ўсталі на барацьбу з ворагам, праявілі мужнасць і духоўную моц. Як пісаў Э. Хемінгуэй, "чалавека можна знішчыць, але яго нельга перамагчы". І нават патрыёты, якія аддалі жыццё за будучыню краіны, будучыню яе людзей, новыя пакаленні, сваёй смерцю духоўна перамаглі чалавеканенавісніцкую ідэалогію нацызму. Моцная кніга і па сваім эмацыйным уздзеянні на чытача. Будучы дакументальнай, яна перадае дух змрочнага часу акупацыі і дух змагання супраць акупантаў.

Кніга «Витебское подполье» – праўдзівая кніга. Яна заснавана на гістарычных фактах. У аснову выдання пакладзены матэрыялы кандыдацкай дысертацыі гісторыка Ніны Іванаўны Дарафеенка, вынікі яе сумеснай з мужам, журналістам Мікалаем Уладзіміравічам Дарафеенкам пошукавай працы».

Трэба адзначыць, што ў кнізе ўзгадваецца больш за тысячу імёнаў віцебскіх змагароў, сярод якіх не толькі мясцовыя жыхары ўсіх узроставых груп, але і вопытныя падпольшчыкі, якіх спецыяльна накіравалі ў наш горад для стварэння падпольнага партыйнага цэнтра (Вера Харужая), а таксама замежныя антыфашысты (Карл Шрадэр, Іаган Лойда).

Пазнаёміцца з трэцім выданнем кнігі «Витебское подполье» можна будзе ў тым ліку і ў чытальнай зале навуковай бібліятэкі нашага ўніверсітэта.

**Падрыхтавала Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**